# РАЗДЗЕЛ 3
# МАЯ СУЧАСНАЯ КРАІНА

## 27. БАГАЦЦЕ НАШАЙ КРАІНЫ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Беларусь апынулася ў вельмі цяжкім становішчы. Нашы гарады і вёскі, фабрыкі і заводы, школы і бальніцы былі разбураны і спалены. Шмат нашых суайчыннікаў загінула на фронце і ў партызанах. Многім людзям не было дзе жыць, не было чаго есці. Не хапала коней і трактароў. Жанчынам і дзецям прыходзілася самім запрагацца ў плугі, каб араць зямлю. Але мужны беларускі народ не скарыўся бядзе. Людзі пабудавалі новыя жылыя дамы, вырасцілі багатыя ўраджаі, наладзілі выраб прадукцыі на прамысловых прадпрыемствах. Галоўным у развіцці гаспадаркі цяпер быў выпуск разнастайных машын.

Візітнай карткай Беларусі сталі магутныя самазвалы Беларускага аўтамабільнага завода ў Жодзіне. БелАЗы працуюць у кар'ерах па здабычы карысных выкапняў далёка за межамі рэспублікі. А самы вялікі з іх — грузападымальнасцю 450 тон — занесены ў кнігу сусветных рэкордаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Самазвал БелАЗ

Магутныя грузавікі Мінскага аўтамабільнага завода — самыя сапраўдныя працаўнікі. МАЗы штодзень перавозяць тысячы тон грузаў. А зрабіў гэтыя машыны такімі спрытнымі і зручнымі **Міхаіл Сцяпанавіч Высоцкі**. Ён прайшоў свой працоўны шлях ад слесара-зборшчыка да генеральнага канструктара па аўтамабільнай тэхніцы. Стварыў сучаснае пакаленне магістральных аўтапаяздоў. Міхаіл Сцяпанавіч стаў Героем Беларусі. За межамі нашай краіны ён атрымаў пачэснае імя «Майкл Грузавік». На міжнародных ралі сёння здабываюць славу гоначныя грузавікі МАЗ. Быццам магутныя зубры, яны няўхільна рухаюцца наперад да перамогі.



М. С. Высоцкі

Вам, канешне, вядомы трактар «Беларус». Але першы бе-

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Гоначны грузавік МАЗ



ларускі трактар быў зусім не такі, як той, што выпускаецца зараз. Трактар-помнік устаноўлены каля Мінскага трактарнага завода. Сучасныя трактары ўніверсальныя, бо здольны выконваць розныя віды работ. Могуць араць зямлю, сеяць, баранаваць, перавозіць грузы, нават падмятаць вуліцы. Нашыя трактары славутыя ва ўсім свеце. Іх назва «Беларус» паведамляе ў розных краінах пра нашу Радзіму і яе працаўнікоў.



Трактар-помнік «Беларус»



Сучасны трактар «Беларус»

Правообладатель Издательский центр БГУ 

Разгледзьце карту «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» на с. 18—19 атласа. Пакажыце на ёй тыя машыны і трактары, якія вырабляюцца ў нашай краіне.

Сучасны чалавек не можа існаваць без транспарту. Жыхары гарадоў і вёсак карыстаюцца чыгункай і ўласнымі аўтамабілямі. Сярод іх можна сустрэць і тыя, што выпускаюцца ў Беларусі. Гараджаніну патрэбны аўтобусы і тралейбусы — іх вырабляюць працаўнікі Мінскага аўтамабільнага завода. Многія з вас ездзяць на веласіпедах, а дарослыя — на матацыклах Мінскага мотавелазавода. Мінчанам дапамагае скараціць час і адлегласць метро. З нацыянальнага аэрапорта ў розныя куткі свету адлятаюць самалёты. Іх лёгка пазнаць у міжнародных аэрапортах. На іх бартах — блакітны малюнак васілька. Быццам са слуцкіх паясоў, якімі мы сёння ганарымся.

Зямля — карміцелька жыхароў нашай краіны. Сельская гаспадарка забяспечвае насельніцтва разнастайнымі прадуктамі харчавання. З чаго пякуць смачны, духмяны хлеб? Вядома, з жытняй мукі. А вось з пшаніцы робіцца мука для булак, печыва, макароны. Другім хлебам завуць беларусы бульбу. З яе гатуюць, напрыклад, дранікі і чыпсы.

Добрыя ўраджаі — вынік цяжкай і карпатлівай працы на зямлі. Восенню на свяце працаўнікоў вёскі «Дажынкі» мы дзякуем людзям,

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Збожжаўборачны камбайн «Палессе»



якія вырасцілі для нас такія ўраджаі. Бо галоўная каштоўнасць нашай краіны — гэта людзі-працаўнікі. А дапамагае ў працы земляробам сучасная сельскагаспадарчая тэхніка. Напрыклад, збожжаўборачныя камбайны пад назвай «Палессе», што вырабляюцца ў Гомелі.



Сучасная кашуля з беларускім народным арнаментам

А што яшчэ вырошчваецца на нашых палях, акрамя бульбы? На поўначы нашай краіны расце «паўночны шоўк». Не здзіўляйцеся. Менавіта так называюць адно з галоўных багаццяў нашай краіны — лён. З яго валокнаў вырабляюць тканіны, абрусы, ручнікі, пасцельную бялізну, кашулі. Вельмі прыгожа глядзяцца беларускія арнаменты на кашулях. Яны сведчаць, што мы не забываем родную гісторыю.

Правообладатель Издательский центр БГУ 

## Карысна ведаць



А. І. Дубко

Хто з вас не марыць аб дасягненнях? Хто лепш вучыцца ці ўдала ўдзельнічае ў розных спаборніцтвах? Ці здзейсніцца ваша мара аб дасягненнях? А ў нашага суайчынніка яна здзейснілася. Больш за дваццаць гадоў працаваў старшынёй калгаса ў Гродзенскім раёне **Аляксандр Іосіфавіч Дубко**. Ён шмат клапаціўся аб зямлі, каб яна добра радзіла. Людзі ганарыліся дасягненнямі свайго земляка. За сваю добрасумленную працу ён стаў спачатку Героем Сацыялістычнай Працы, а затым і Героем Беларусі. Ён — адзіны такі чалавек у нашай гісторыі. Дзве яго залатыя зоркі — як два этапы развіцця нашай Радзімы. Адзін з іх — час існавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. А другі ўжо — Рэспублікі Беларусь. Пра Аляксандра Іосіфавіча можна сказаць, што чалавек жыве ў добрых справах, якія зрабіў. Памяць аб гэтым чалавеку захоўваецца ў спадчыне, якую ён пакінуў сваім нашчадкам.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Пералічыце машыны, якія выпрабляе прамысловасць нашай краіны. Назавіце буйны́я прамысловыя прадпрыемствы ў Беларусі.
2. Раскажыце, якімі прадуктамі харчавання забяспечвае насельніцтва нашай краіны сельская гаспадарка.
3. Назавіце імёны славутых працаўнікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.
4. Якім транспартам карыстаюцца жыхары нашай краіны? Які больш любіце вы самі і вашы сябры?

1. Вызначце, што за прадукцыю выпрабляюць ці вырошчваюць там, дзе вы жывяце. Выкарыстайце для адказу карты «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» і «Рэспубліка Беларусь. Сельская гаспадарка» на с. 18—21 атласа.
2. Пакажыце на карце «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» на с. 18—19 атласа транспартныя шляхі, якія праходзяць праз нашу краіну.
3. Прапануйце ў якасці назваў для нашых самалётаў імёны славутых беларусаў.

Раскажыце, якія з айчынных тавараў вы хацелі б выпрабляць самі, калі станеце дарослымі. Што вы можаце прапанаваць, каб зрабіць іх больш зручнымі?

Правообладатель Издательский центр БГУ 

# 28. ТУТ МІНУЎШЧЫНА З СУЧАСНАСЦЮ СЫШЛІСЯ

Большая частка насельніцтва нашай краіны жыве ў гарадах. Іх у нашай краіне больш за 100. Прыблізна столькі ж і гарадскіх пасёлкаў. Калісьці яны называліся цудоўнаю назвай — мястэчкі. Насельніцтва гарадоў расце, бо болей становіцца саміх гарадоў. У кожнага з іх сваё непаўторнае аблічча, свая гісторыя. Адны славяцца старажытным мінулым. Вы ўжо ведаеце пра самы старажытны беларускі горад Полацк. Іншыя гарады, наадварот, вызначаюцца сваёй маладосцю.

Побач са старажытным Полацкам на левым беразе Заходняй Дзвіны пабудаваны Наваполацк. Тут знаходзіцца завод па перапра-



Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод

 Правообладатель Издательский центр БГУ

цоўцы нафты, вядомы на ўсю Беларусь. На гэтым заводзе калісьці быў атрыманы першы беларускі бензін — паліва для нашых аўтамабіляў і іншых разнастайных машын. Вядомы завод і далёка за межамі Беларусі, бо большасць яго прадукцыі пастаўляецца ў еўрапейскія краіны. За 50 гадоў існавання на заводзе перапрацавана 700 мільёнаў тон нафты. Для гэтага спатрэбілася праца трох пакаленняў перапрацоўшчыкаў нафты, мантажнікаў, будаўнікоў.

Адзін з самых буйны́х маладых гарадоў — Салігорск. Пра яго назву ёсць такое паданне. Нашы продкі, якія жылі тут раней, пралілі шмат горкіх слёз. Слёзы прамачылі зямлю. Ды так глыбока зацяклі яны ў зямлю, што ўтварылася з іх салёнае мора. А потым



Здабыча калійнай солі ў шахце

Правообладатель Издательский центр БГУ 

ператварылася яно ў соль зямлі. Гэта толькі паданне, а насамрэч горад узнік побач з залежамі калійных солей. Тут пачалі здабываць гэтыя падземныя багацці. Так у Беларусі з'явілася новая прафесія — шахцёры. Толькі здабываюць яны не вугаль, а калійныя солі. Гэтыя солі перапрацоўваюцца ў мінеральныя ўгнаенні. Без такіх угнаенняў немагчыма збіраць высокія ўраджаі. Таму і ўдзячныя шахцёрам хлебаробы.

Недалёка ад Мінска ёсць горад Жодзіна. Тут вырабляюць магутныя самазвалы, якія перавозяць шматтонныя грузы. Гасцей горада ўражвае помнік у гонар маці-патрыёткі **Настассі Фамінічны Купрыянавай**. Пяць яе



Помнік маці-патрыётцы Н. Ф. Купрыянавай
і яе сынам у Жодзіне

 Правообладатель Издательский центр БГУ

сыноў абаранялі нашу Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх малодшы — Пётр. У 1944 годзе пры вызваленні суседняй Латвіі ён закрыў сваім целам варожы кулямёт. Гэты подзвіг захаваў жыццё многіх салдат. Мужнаму воіну было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Астравец — калісьці невялічкі пасёлак у Гродзенскай вобласці. Яшчэ раней — былая вёска, якой больш за пяцьсот гадоў. Цяпер гэта сучасны новы горад, які імкліва будуецца. Непадалёк ад яго распачалося ўзвядзенне Беларускай атамнай электрастанцыі. Вось так мінуўшчына сышлася тут з сучаснасцю.



Астравецкая АЭС (макет)

Правообладатель Издательский центр БГУ 



Герб Астраўца

Ужо цяпер у нашай краіне рыхтуюць спецыялістаў-атамшчыкаў. Яны будуць працаваць на станцыі.

Разгледзьце карту «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» на с. 18—19 атласа. Пакажыце на ёй пералічаныя ў апавяданні гарады. Назавіце вобласці, у якіх яны знаходзяцца.

**Карысна ведаць**

Наш народ памятае аварыю, што адбылася на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі ў 1986 г. Адным з тых, хто ліквідаваў аварыю, стаў наш 25-гадовы суайчыннік **Васіль Ігнаценка**. Ён служыў у пажарнай камандзе па ахове станцыі. Калі над станцыяй узнялося полымя, кінуўся яго тушыць. Толькі агонь гэты быў незвычайны. За ім хавалася небяспечная для чалавека радыяцыя. Гэта адбылося ў ноч з 25 на 26 красавіка. А потым былі яшчэ 18 дзён змагання за жыццё пасля смяротнай дозы апраменьвання. Але радыяцыю перамагчы не ўдалося.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

За гераічны подзвіг дзеля жыцця цяперашніх і будучых пакаленняў беларусу Васілю Ігнаценку прысвоена званне Героя Украіны. На яе тэрыторыі ў непасрэднай блізкасці ад Беларусі знаходзілася станцыя. Імя гераічнага пажарнага носіць адна з мінскіх вуліц.



Герой-пажарны В. Ігнаценка

1. Як тлумачацца назвы гарадоў Наваполацк і Салігорск?
2. Якія сучасныя прафесіі патрэбныя ў гарадах?
3. Раскажыце аб прадукцыі, якую выпрацоўваюць на прадпрыемствах у Наваполацку і Салігорску. Пры адказе выкарыстайце карту «Рэспубліка Беларусь. Прамысловасць» на с. 18—19 атласа.
4. Раскажыце пра подзвіг Васіля Ігнаценкі.

Як вы лічыце, што можна зрабіць, каб вашы горад ці вёска сталі яшчэ больш утульнымі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Намалюйце герб Астраўца, якім ён бачыцца вам у сувязі з будаўніцтвам тут Беларускай атамнай электрастанцыі. Выкарыстайце для прыкладу і параўнання сучасны гарадскі герб, змешчаны на с. 126 вучэбнага дапаможніка.

## 29—30. МІНСК — СТАЛІЦА НАШАЙ КРАІНЫ

Мінск — галоўны палітычны, гаспадарчы, культурны, навуковы цэнтр нашай рэспублікі. Гэта старажытны і адначасова малады горад. Яму споўнілася болей за 950 гадоў. Яго гісторыю вы ўжо крыху ведаеце. Шмат разоў горад перабудоўваўся. У час Вялікай Айчыннай вайны ён быў амаль увесь зруйнаваны. Але падняўся з попелу і руін. Нашай сталіцы было прысвоена званне «Горад-герой». За нядоўгі час Мінск ператварыўся ў адзін з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы.

**Праспекты і вуліцы горада.** Сёння ў Мінску сотні вуліц і праспектаў. Цэнтральнай магістраллю з'яўляецца праспект Незалежнасці. Уздоўж яго знаходзіцца шмат устаноў. Напрыклад, дзяржаўныя ўстановы — Дом урада і рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Навуковай установай, будынак якой узведзены на праспекце Незалежнасці, з'яўляецца


Правообладатель Издательский центр БГУ